Аддзел па адукацыі Шумілінскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“

# *Традыцыі і сучаснасць*

***Зборнік майстар-класаў***

Складальнікі:
Мураўёва Тамара Мікалаеўна,
Бадзешчанкава Валянціна Уладзіміраўна,
метадысты Шумілінскага РЦДіМ

*Шуміліна, 2018*

Рэцэнзент
дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацы
”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“ Р.А. Туманова
Складальнікі:
метадысты Т.М. Мураўёва, В.У. Бадзешчанкава

Рэкамендавана
метадычным саветам ДУДА ”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“
14 студзеня 2019 года, пратакол №4

**Традыцыі і сучаснасць** / Зборнік майстар-класаў / скл. Т.М. Мураўёва, В.У. Бадзешчанкава ; Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі. – Шуміліна, 2019. – 51 с.

У зборніку прадстаўлены распрацоўкі майстар-класаў, распрацаваных у рамках правядзення міжрэгіянальных майстар-класаў ”Абрадавая атрыбутыка і народная лялька ў святочнай культуры беларусаў“.

Адрасавана педагогам дадатковай адукацыі, настаўнікам працоўнага навучання.

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі ”Шумілінскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“

## Змест


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 4 |
| Майстар-клас ”Бытавы танец ”Какетка“ | 7 |
| Майстар-клас ”Саламяная лялька“ | 19 |
| Майстар-клас ”Драўляная цацка ”Жаваранак“ | 30 |
| Майстар-клас ”Выкананне ўзора-абярэга ў беларускім арнаменце“ | 37 |
| Майстар-клас ”Сувенір у тэхніцы прапільной разьбы па драўніне“ | 45 |

## Уводзіны

Кожны народ мае свае карані – глыбінныя, якія цягнуцца ажно з часоў першага расслення людзей. Сёння, калі мы разважаем аб адраджэнні беларускай культуры, якая набывае новыя якасці і масштаб, перш за ўсё думаем аб народнай творчасці, аб пашырэнні яе ролі ў нашым жыцці, аб аднаўленні адносін да яе. Каб дрэва зелянела і расло, неабходна ўмацаваць яго карані. І тут нельга перабольшыць тую ролю, якую можа і павінна адыграць народная творчасць у выхаванні пакаленняў, у далучэнні іх да культуры, мастацтва, творчасці, да народных традыцый. Стварэнню этнакультурнай прасторы ў Шумілінскім цэнтры дзяцей і моладзі ў значнай меры паспрыяла сумесная дзейнасць педагогаў і навучэнцаў па распрацоўцы і рэалізацыі праекта ”Традыцыі і сучаснасць“ Праект ”Традыцыі і сучаснасць“ уключаў ў сябе наступныя мерапрыемствы:

1. Удзел у міжрэгіянальных майстар-класах:

”Мастацтва беларускага дэкаратыўнага роспісу, вопыт і творчае выкарыстанне ў педагагічнай дзейнасці“;

”Творчасць і майстэрства – шлях да дасканаласці“;

”Абрадавая атрыбутыка і народная лялька ў святочнай культуры беларусаў“.

Наведванне майстар-класаў садзейнічала павышэнню прафесіяналізма і развіццю педагагічнага майстэрства, пошуку творчага рашэння педагагічных задач і праблем, набыццю вопыту праектавання і правядзення майстар-класаў.

2. Выставы дзіцячай творчасці.

Гэта эффектыўная форма прад’яўлення дасягненняў навучэнца і педагога, паказа вынікаў іх сумеснай работы, навучання і выхавання; таксама гэта выдатны спосаб прапаганды і папулярызацыі дзіцячай творчасці.

3. Адкрытыя выхаваўчыя мерапрыемствы. Педагогамі дадатковай адукацыі Шумілінскага РЦДіМ у рамках праекта была праведзена панарама адкрытых выхаваўчых мерыпрыемстваў:

творчыя майстэрні ”Традыцыі беларускага народа. Кукла-берагіня“ (педагог дадатковай адукацыі Пятроўская Н.Л.); ”Саламяны свет лялькі“ (педагог дадатковай адукацыі Каласкова Т.П.);

калядныя вячоркі ”У чаканні свята“ (педагогі дадатковай адукацыі Грыгор’ева А.С., Каласкова Т.П.);

харэаграфічная гасцёўня ”Купальскія гулянні“ (педагог дадатковай адукацыі Шарава Ю.У.);

пазнавальна-забаўляльная праграма ”Прыйшла Каляда – адчыняй вароты“ (педагог дадатковай адукацыі Мульц В.С.).

сюжэтна-гульнёвая праграма ”Масленіца“ (педагогі дадатковай адукацыі Раманава С.Ю., Шарава Ю.У.);

калектыўна-творчая справа ”Добрым молайцам урок…“ (педагог дадатковай адукацыі Грыгор’ева А.С.);

гульня-падарожжа ”Драўляны свет Беларусі“ (педагог дадатковай адукацыі Пціцікі А.Я.).

4. Рэалізацыя міні-праектаў.

У рамках праекта ”Традыцыі і сучаснасць“ былі распрацаваны і рэалізаваны мініпраекты ў аб’яднаннях па інтарэсах мастацкага профілю: ”Гісторыя ўзнікнення саламянай лялькі“ (педагог дадатковай адукацыі Каласкова Т.П.), ”Беларуская народная драўляная цацка“ (педагог дадатковай адукацыі Пціцкі А.Я.), ”Драўляная дынамічная цацка“ (педагог дадатковай адукацыі Танасіенка Ю.М.), ”Узор-абярэг у беларускім арнаменце“ (педагог дадатковай адукацыі Сілкіна М.А.), ”Паштоўкі ў тэхніцы ”выцінанка“ на тэму нацыянальных святаў Беларусі“ (педагог дадатковай адукацыі Чупрукова Т.В.).

5. Экскурсіі.

На працягу двух гадоў рэалізацыі праекта педагогамі дадатковай адукацыі Шумілінскага РЦДіМ былі праведзены адукацыйныя экскурсіі:

дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці;

дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Віцебскі тэхналагічны каледж“ (навучэнцы і педагогі цэнтра сталі ўдзельнікамі экскурсіі па каледжу, майстар-класаў, якія правялі выкладчыкі ўстановы);

Шумілінскі Дом рамёстваў;

Цэнтр народных культур і рамёстваў г. Полацка..

Далучэнне да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы – важны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. У сучасных умовах сродкі масавай інфармацыі выцясняюць самабытную традыцыйную культуру, аддаляюць маладое пакаленне ад мінулай самабытнай культуры

народа, губляюцца карані. Гэтую праблему мы паспрабавалі вырашыць праз рэалізацыю праекта ”Традыцыі і сучаснасць“. Эфектыўнасць рэалізацыі праекта праяўляецца перш за ўсё ў тым, што ён садзейнічае развіццю цікавасці навучэнаў да беларускага народнага мастацтва, традыцый беларусаў. Адраджаючы традыцыі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, харэаграфіі, і надаючы асаблівую ўвагу выкарыстанню беларускіх рамёстваў у дзіцячай творчасці, мы ўзнаўляем вобразы даўніны, што звязываюць нас з мінулым. Відавочна, што праз вывучэнне гістарычнай спадчыны ажыццяўляецца повязь паміж сучаснікамі і папярэднімі пакаленнямі нашага народа, узнікае жаданне зберагчы тое, што ёсць, і сваімі намаганнямі прымножыць культурныя і сацыяльныя набыткі нашай Беларусі.

Працягам работы цэнтра ў гэтым накірунку з’яўляецца правядзенне майстар-класаў у рамках міжрэгіянальных майстар-класаў ”Абрадавая атрыбутыка і народная лялька ў святочнай культуры беларусаў“. Абраная тэматыка майстар-класаў адпавядае веснавым народным святам, мясцовым народным рамёствам.

Педагогі дадатковай адукацыі прымаюць удзел у рэалізацыі новага праекта цэнтра ”Беларусь святочная“.



*Удзельнікі міжрэгіянальных майстар-класаў*

## Майстар-клас ”Бытавы танец ”Какетка“



**<u>Педагог-майстар</u>:** Раманава Святлана Юр’еўна, педагог дадатковай адукацыі 1 кваліфікацыйнай катэгорыі. Працоўны стаж – 27 гадоў. Кіруе танцавальным калектывам ”Смяшарыкі“.

Педагог знаёміць навучэнцаў з рознымі жанрамі харэаграфічнага мастацтва: класічным, сучасным (эстрадным), народным танцам. Танцавальны калектыў актыўны удзельнік раённых і абласных мерапрыемстаў.








Мэта: павышэнне прафесійнага ўзроўню педагогаў - удзельнікаў майстар-класа ў працэсе актыўных педагагічных зносін, абмену вопытам.

Задачы:

стварыць спрыяльныя ўмовы для прафесійных зносін, творчага самавыяўлення, супрацоўніцтва і ўзаеманавучання;

развіваць асэнсаванае выкананне рухаў у бытавым танцы ”Какетка ";

прадэманстраваць вопыт работы па адраджэнні нацыянальных традыцый у харэаграфічным мастацтве.

Мэтавая аўдыторыя: педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі абслугоўваючай працы.

Матэрыялы і абсталяванне: магнітафон, аўдыёзапіс танца.

## Ход правядзення майстар-класа

### Тэарэтычная частка

Танцавальнае мастацтва – адзін з самых папулярных відаў мастацтва ў свеце. Ім захапляюцца і дзеці, і моладзь, і людзі старэйшага ўзросту.

Танец з’яўляецца дадатковым рэзервам рухальнай актыўнасці, крыніцай здароўя, радасці, станоўчых эмоцый, павышэння працаздольнасці. Сёння размова пойдзе пра бытавы танец.

Характэрныя асаблівасці бытавых танцаў пачалі фарміравацца ў далёкім мінулым. Кожны танец мае сваю групу элементаў руху, сваё музыкальнае суправаджэнне, свой рытмічны малюнак.

Класіфікаваць велізарную разнастайнасць бытавых танцаў вельмі складана. Самае простае - падзел па народах і гістарычных перыядах, у якія былі распаўсюджаны тыя ці іншыя танцы. Напэўна, кожны зможа адрозніць самабытныя танцы Палесся і танцы Паазер’я. Пагадзіцеся, яны вельмі розныя! Але іх аб’ядноўвае як раз тое, што яны перадаюць асаблівы, непаўторны характар народа, які пражывае ў той ці іншай мясцовасці.

Любое свята альбо абрад на тэрыторыі Шумілінскага раёна не абыходзіўся без вясёлых бытавых танцаў. Найбольш папулярныя бытавыя танцы на Шумілiншчыне ”Ой, ляцелі птушачкі“, ”Каробачка“, ”Какетка“.

Усе танцы лічыліся парнымі і па сваёй стылістыцы падобны паміж сабой. Асноўныя адрозненні заключаюцца ў сэнсавым кантэксце, кожны танец нясе сваю гісторыю і эмацыянальную афарбоўку, але энергічнасць, дынаміка, весялосць захоўваецца ў кожным бытавым танцы.

Удзельнікі танцавальнага калектыву наведалі Шумілінскі Дом рамёстваў. Сустрэліся з Вольгай Вітальеўнай Загвоздавай (дадатак 1), кіраўніком народнага клуба майстоў мастацкіх рамёстваў ”Спадчына“. Яна пазнаёміла з народнымі касцюмамі Шуміліншчыны: традыцыйны святочны жаночы касцюм Шумілінскага рэгіёну (канец XIX – пачатак XX стст., дадатак 2); традыцыйны мужчынскі строй Шумілінскага рэгіёну (канец XIX – пачатак XX стст., дадатак 3); традыцыйны жаночы строй Шумілінскага рэгіёну (касцюм пажылой жанчыны, канец XIX – пачатак XX стст., дадатак 4).

Асаблівая ўвага была скіравана на дзіцячы касцюм Шумілінскага рэгіёну канца XIX - пачатку XX стст. (дадатак 5). Мажліва ў такіх касцюмах нашы продкі і танчылі танец ”Какетка“.

Вывучэннем бытавых танцаў на Шуміліншчыне займалася кіраўнік народнага фальклорнага калектыву ”Гульбічы“ дзяржаўнай установы культуры ”Шумілінскі раённы цэнтр культуры“ Цыркунова Ларыса Іванаўна (дадатак 5). Пра бытавы танец ”Какетка“ Ларысе Іванаўне ў 1977 годзе распавядала Меліхава Юлія Фядотаўна, ураджэнка вёскі Добея Шумілінскага райна. Гэты танец танчылі ў вёсках Добея і Лескавічы на вячорках. Адметная асаблівасць танца ”Какетка“ Шумілінскага рэгіёну - гэта крок і двайны прытоп.

**Практычная частка**

Танец ”Какетка“ – гэта групавы парны танец, выконваецца па крузе па лініі танца (супраць гадзіннікавай стрэлкі).

Музычны памер - 2/4.

<u>Апісанне танца</u>



Перад пачаткам танца пары выстрайваюцца ў круг, тварам па лініі танца. Партнёр правай рукой трымае за левую руку партнёрку. Левая рука партнёра на поясе. Правая рука партнёркі злёгку адведзена ў бок.

Зыходнае становішча - 6 пазіцыя ног.

**Партыя партнёркі:**
**1 частка танца:**



1-ы такт:
на лік ”раз“ - крок правай нагой ўперад.
на лік ”і “, ”два“ - двайны прытоп.
на лік ”і“ - паўза.
2-ы такт:
паўтор першага такта.
3-ці такт:
на лік ”раз“, ”і“ - правая нага выстаўляецца на насок ўперад.
на лік ”два“, ”і“ - правая нага выстаўляецца на насок ў бок.
4-ы такт:
на лік ”раз“, ”і“ - правую нагу прыстаўляем ў зыходнае становішча.
на лік ”два“, ”і“ - паўза.
5-ы - 8-ы такты - гэта паўтор 1-га - 4-га такта.

**2 частка танца:**



1-ы, 2-і такты: паварот вакол сябе з правай нагі.

3-й такт:



на лік ”раз“, ”і“ – прысюды: правая нага наперад, левая назад, адначасова разводзячы іх наперад - назад.
на лік ”два“, ”і“ – прысюды: левая нага наперад, правая назад, адначасова разводзячы іх наперад - назад.

4-ы такт:



налік ”раз“, ”і“ - саскок на дзве нагі.

на лік ”два“ - ”і“ - паўза.



5-ы, 6-ы такты – паварот пад правай рукой партнёра з правай нагі.



7-ы, 8-ы такты – 3 хлапкі ў далоні партнёра.

**Партыя партнёра:**

Такая ж партыя, як і ў партнёркі, толькі з левай нагі.

У другой частцы танца на 5-ы, 6-ы такты - партнёр стаіць па 6 пазіцыі (падчас павароту партнёркі).

Танец паўтараецца па крузе некалькі разоў.

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Ці спадабаўся вам майстар-клас?

Наколькі цяжка / лёгка было выконваць рухі танца?

Жадаю Вам поспехаў у вашай працы, новых творчых перамог!

## Літаратура і інфармацыйны рэсурс:

1. Браславская, Д.И. Мастер-класс для педагогов дополнительного образования / Д.И. Браславская // Дополнительное образование и воспитание. – 2008. - №5. – С.26-28.
2. Буренина, А.И. Ритмическая мозаика / Буренина А.И. – С.-П., 2000. – 220 с.
3. Ваганова, А. Основы классического танца / А. Ваганова. – М., 1963.
4. Вакар, Л.М. Народная культура Віцебшчыны / Л.М. Вакар. - Віцебск: УА"ВДУ імя П.М.Машэрава", 2007. - с.271.
5. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне / М.Ф.Раманюк. - Мінск: Беларусь, 1981. - с.317.
6. Хворост, И. Белорусский танец / И. Хворост. – Мн., 1977.
7. Чурко, Ю. Белорусский народный танец / Ю. Чурко. – Мн.,1972.

Дадатак 1

Падчас сустрэчы з Вольгай Вітальеўнай Загваздавай



Дадатак 2

Традыцыйны святочны жаночы строй Шумілінскага рэгіёну
(канец XIX – пачатак XX стст.)



Дадатак 3

Традыцыйны мужчынскі строй Шумілінскага рэгіёну
(канец XIX – пачатак XX стст.)



Дадатак 4

Традыцыйны жаночы строй Шумілінскага рэгіёна
(касцюм пажылой жанчыны. Канец XIX – пачатак XX стст.)



Дадатак 5

Дзіцячы касцюм Шумілінскага рэгіёну канца XIX-пачатку XX стст.



Дадатак 6

Падчас сустрэчы з Ларысай Іванаўнай Цыркуновай



## Майстар-клас ”Саламяная лялька“



**<u>Педагог-майстар</u>:**

Каласкова Таццяна Пятроўна,

педагог дадатковай адукацыі. З 1994 года працуе ў Шумілінскім раённым цэнтры дзяцей і моладзі, кіруе аб’яднаннямі па інтарэсах ”Залатая саломка“, ”Майстар“, ”Прырода і фантазія“. Асноўнай задачай сваёй працы педагог лічыць распаўсюджанне творчага педагагічнага вопыту па зберажэнню традыцый і развіццю інавацый у народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Таццяна Пятроўна член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.









Мэта: знаёмства з традыцыйным відам народнай творчасці – саломапляценнем.

Задачы:

навучыць паслядоўнасці вырабу традыцыйнай саламянай лялькі;

стварыць умовы для прадуктыўнага ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва і ўзаеманавучання;

спрыяць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, вывучэнню традыцый;

павысіць прафесійную кампетэнтнасць і педагагічнае майстэрства педагогаў дадатковай адукацыі.

Удзельнікі майстар-класа: педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі абслугоўваючай працы.

Матэрыяльнае забеспячэнне майстар-класа: саломка, ніткі, нажніцы, клей, дэкаратыўная стужка.

## Ход правядзення майстар-класа

**Тэарэтычная частка:**

У паўсядзённым жыцці селяніна салома знаходзіла самае шырокае прымяненне. Паедзе ён за дравамі альбо ў горад – пакладзе пад бок ахапак саломы, а намокнуць валёнкі – абавязкова наб’е іх саломай, каб не згубілі формы. Нечым набіць сяннік – на дапамогу прыйдзе салома. Нельга было абысціся без саломы, калі ўзнікала неабходнасць захоўваць бульбу ў буртах: пад саломай ёй і лютыя маразы не страшныя. Скаціне падаслаць, хлеў уцяпліць, дах накрыць – зноў патрэбна салома. У цэлым, салома шырока выкарыстоўвалася ў сялянскай гаспадарцы. Здаўна існуе ў народзе прыказка: саломінай не падапрэж хароміны. З гэтым, безумоўна, ніхто не спрачаецца: салома выкарыстоўваецца ў прыказках і прымаўках як сімвал крохкасці. У мінулым салома мела самыя прамыя адносіны да сельскага будаўніцтва. Яна ішла на будаўніцтва не толькі даха, але і сцен у асноўным сялянскіх пабудоў. Уцяплялі саломай і драўляныя сцены хат.

Сечаную салому раней дабаўлялі ў гліну, з якой збівалі цагліны-сырцы. Потым іх толькі прасушвалі на сонцы. У скульптурнай майстэрні салома знаходзіла самае незвычайнае прымяненне. У гліну дабаўлялі не саму салому, а яе адвар. Старыя майстры лічылі, што гліна, замешаная на саламяным адвары, пры высаханні не дае шчылін. Яшчэ саламяны адвар не

дае гліне хутка высахнуць, што дае мажлівасць пэўны прамежак часу працаваць спакойна, не баючыся, што яна страціць пластычнасць.

Адвар з саломы нават выкарыстоўвалі лекары.

Салома ў жыцці селяніна была арганічным матэрыялам у працы і ў абрадавай дзейнасці.

Дэкаратыўная ўласцівасць саломкі была прыкмечана даўно. Салома, маючы прыемны бурштынавы колер і мяккі мігатлівы бляск, заўсёды прыцягвала ўвагу народных майстроў.

У Беларусі вядучай зерневай культурай было жыта, таму ў паўсядзённым жыцці сялян часцей за ўсё даводзілася мець справу з жытняй саломай. Пры вырабе пэўных рэчаў ўлічваліся асаблівасці кожнага віду саломы, бо салома саломе розніца, нездарма, сяляне склалі прымаўку: ”Грачаная салома крывая, ячменная смачная, пшанічная пышная“.

”Ржаніца“ - так даўней звалі жытнюю салому - была доўгай, прамой і трывалай. Распараная, абмытая вадой, яна станавілася настолькі трывалай і гнуткай, што з яе можна было плесці вельмі дробныя вырабы з тонкім аздабленнем.

На Беларусі пляценнем з саломкі займаліся здаўна. З саломкой прыемна працаваць: яна залатая, гладкая, гібкая, пахучая. Прыродная здольнасць саломкі гнуцца і захоўваць дадзеную форму дазваляе ствараць з яе фігуркі лялек, розных жывёлін і тэматычныя кампазіцыі.

Лёс беларускага саломапляцення складваўся не заўсёды шчасліва. Былі як перыяды росквіту, так і заняпаду.

Росквіт беларускага саломапляцення прыпадае на канец XVIII - пачатак XIX стагоддзяў. У гэты час беларускімі майстрамі былі створаны ўнікальныя ў гісторыі мастацтва саламяныя Царскія вароты. Да нашых дзён захавалася трое Царскіх варот, двое з іх захоўваюцца ў Музеі беларускага народнага мастацтва вёскі Раўбічы пад Мінскам, адны ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі. Вучоныя мяркуюць, што саламянае афармленне мелі цэлыя іканастасы ў цэрквах.

Заняпад у саломапляценне пачаўся з сярэдзіны XIX стагоддзя. Саламяныя выявы жывёл і птушак гублялі сваю абрадавую значнасць і паступова перайшлі ў ранг дзіцячых цацак. Саламяныя бытавыя вырабы для захоўвання прадуктаў таксама сталі выцясняцца сучаснымі вырабамі.

Новы ўзлёт ў гісторыі беларускага саломапляцення прыпадае на 1960-я гады XX стагоддзя. З гэтага часу саломапляценне стала інтэнсіўна

ўзбагачацца новымі прыёмамі пляцення. Асабліва ярка развіваўся мастацкі бок саламяных вырабаў.

Беларусь - адна з нешматлікіх краін свету, дзе саломапляценне атрымала інтэнсіўнае сучаснае развіццё. Аматары і энтузіясты гэтага мастацтва ва ўсім свеце займаюцца захаваннем яго традыцый. Члены нацыянальных гільдый саломапляцення збіраюцца на міжнародныя сустрэчы і фестывалі, праводзяць майстар-класы, на якіх вывучаюць асаблівасці нацыянальных школ саломапляцення. Узровень работ беларускіх майстроў, быў ацэнены імі як эталон сучаснага мастацтва саломапляцення, які захоўвае і развівае яркую нацыянальную індывідуальнасць.

Беларускае мастацтва саломапляцення, дзякуючы працам мастакоў, майстроў, мастацтвазнаўцаў, годна ўваходзіць у скарбніцу дасягненняў сусветнай мастацкай культуры.

Шырокае распаўсюджанне ў Беларусі атрымалі народныя цацкі з саломы. Пляценне з саломкі аб'ёмных фігур - лялек, жывёл, птушак - сыходзіць сваімі каранямі ў далёкае мінулае. Саламяную ляльку рабілі ўсюды, дзе вырошчвалі хлеб. Дарослыя рабілі іх для сваіх дзяцей як абярэгі. Такія лялькі не мелі асобы, і, такім чынам, яны лічыліся прадметам неадушаўлёным, недаступным для ўсялення ў яго злых сіл, а значыць, бясшкодным для дзіцяці. Разам з тым асноўнае значэнне саламянай лялькі - гульня, забаўка, забава не толькі для дзяцей, але і дарослых. Лялькі з саломы называюць ”стрыгушкамі“ таму што, пучок саломы, з якіх іх звязваюць, унізе роўна стрыгуць. Часцей за ўсё лялькі зроблены толькі з аднаго пучка саломы. Паходжанне прыёмаў скручвання, перагібання пучка саломы караніцца ў працоўных навыках па ўборцы ўраджаю. Так жанчыны скручвалі перавясла з пучка саломін, якімі абвязвалі сноп каласоў. На працягу стагоддзяў саламяная лялька была звязана толькі з сялянскай культурай. Яе выраб абмяжоўваўся рамкамі вёскі, сялянскай сям'і і, у адрозненні ад вытворчасці драўляных і гліняных цацак, не набыў прамысловага характару.

Саламяныя лялькі ручной работы - гэта незвычайна кранальныя і мілыя вырабы. Яны падабаюцца ўсім і дзецям, і дарослым. Іх незвычайную мяккасць і пах адпраўляе нас у казку. Лялькі выкарыстоўваюцца не толькі для гульняў, але і як сувеніры. Кожная лялька мае сваё прызначэнне.

У асяроддзі жней, якія маюць багатае ўяўленне, нарадзілася загадка: ”Маленькі Афанасій траўкай аперазаны“. І, вядома ж, кожны сельскі жыхар пазнаваў ў ”маленькім Афанасіі“ жытні ці пшанічны сноп. Пучок саломы, перавязаны жгутом, служыў асновай традыцыйных сялянскіх лялек.

Для вырабу лялек выкарыстоўвалася ў асноўным тонкая і сярэдняй таўшчыні саломка без каленцаў. Даўжыню сцябла вызначала памер лялькі. З аднаго пучка саломы можна зрабіць ляльку вышынёй 15-20 см. Каб лялька атрымалася вобразнай і мастацка-выразнай, яе неабходна ”апрануць“, дапоўніць каркас дэкаратыўнымі накладнымі дэталямі. Вопратка лялек можа быць зроблена з льнянога валакна, тасьмы, каляровых нітак або сплецена з саломкі. Найбольш арганічна выглядае прычоска, выкананая, як і сама лялька, з саломкі. Галаўныя ўборы саламяных лялек могуць быць самымі разнастайнымі: вянкі з каласкоў альбо плеценых стужак, касынкі з абрэзкаў тканіны.

## Захавальнікі саламяных традыцый Шуміліншчыны

## *Сям’я Каласковых*


Сям’я майстроў Каласковых

Для Шумілінскага раёна і Віцебскай вобласці творчасць сям’і Колосковых паказальна як прыклад сямейнага калектыву, які працуе ў традыцыйным кірунку - пляценне з саломкі і лазы.

Вядомую ў раёне і вобласці сям’ю майстроў ўзначальвае Уладзімір Пятровіч Каласкоў - майстар па пляценні з лазы і саломы. Цікавасць да працы з саломкай яму прывіла маці і навучыла вырабляць павукоў. Урокі маці далі свае вынікі ў сталым узросце, калі ён стаў першым настаўнікам для жонкі - Таццяны Пятроўны. В.П. Каласкоў скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.

Творчы шлях мужа і жонкі развіваўся сумесна. Абодва працягнулі вывучэнне саломапляцення на абласных курсах пры Віцебскім абласным

навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці. З розніцай у некалькі гадоў былі прынятыя ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці.



Аляксандра Оўчанка

З часам бацькі прывілі любоў да рамяства сваёй дачцэ Аляксандры, якая з 7 гадоў дапамагала ім выконваць асобныя элементы вырабаў, а з 2001 года стала працаваць самастойна.

Усе члены сям'і валодаюць традыцыйнымі і сучаснымі прыёмамі пляцення. Часта ў работах спалучаюць саломку з лазой, вырабляюць увесь асартымент традыцыйных вырабаў з саломы, а таксама распрацоўваюць сучасныя дэкаратыўныя кампазіцыі.



Працуюць толькі з натуральным матэрыялам, салому нарыхтоўваюць у ліпені і адбельваюць на сонцы.

Уся сям'я з'яўляецца членамі Народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў Шумілінскага Дома рамёстваў.

### *Наталля Аляксандраўна Сцержанкова*



Н.А. Сцержанкова

Наталля Аляксандраўна Сцержанкова нарадзілася ў вёсцы Палата Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Вучылася ў Полацкім прафесійна-тэхнічным вучылішчы на краўца-закройшчыка, наведвала гуртке аплікацыі саломкай у І.В. Жаваранкавай, якая стала яе першым настаўнікам аплікацыі. У 1999 годзе вучылася на курсах саломапляцення пры Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці.

Больш за 10 гадоў майстар вядзе дзіцячы гурток саломапляцення і аплікацыі ў Шумілінскім Доме рамёстваў, з'яўляецца членам Народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў. Мае свае тэхналагічныя асаблівасці ў аплікацыі, а таксама аўтарскія пляцёнкі ў саломапляценні, якімі дзеліцца са сваімі вучнямі.



Творчасць майстра багата і разнапланава. Яна выконвае ўтылітарна-дэкаратыўныя вырабы (шкатулкі, сухарніцы), саламяную скульптуру (лялек, птушак), галаўныя ўборы (мужчынскія і жаночыя капялюшы, дзявочыя вяночкі), дэкаратыўныя пано, разнастайныя кветкі і жаночыя ўпрыгажэнні, дэкаратыўныя маскі і шмат іншага.



Асаблівае месца ў яе творчасці займае выраб павукоў, вялікая калекцыя якіх знаходзіцца ў фондзе Шумілінскага Дома рамёстваў.



Н.А. Сцержанкова актыўна ўдзельнічае ў раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях, выставах, кірмашах рамёстваў. Яна з'яўляецца лаўрэатам абласной выставы ”Жывая легенда“.

Творчасць Наталлі Аляксандраўны - адоранага і плённага майстра - абапіраецца на народныя традыцыі і паспяхова развіваецца ў цяперашні час.

**Практычная частка:**

Для пляцення выкарыстоўваюць пераважна жытнюю саломку, бо сярод злакавых раслін сцябло жыта мае найбольшую даўжыню і адрозніваецца трываласцю. Пшанічная саломка таксама прыдатная для пляцення, але яна карацей і таўшчэй жытняй. Для пляцення невялікіх дэталяў і дэкаратыўнага аздаблення вырабаў выкарыстоўваюць таксама і аўсяную салому, якая мае прыгожае жоўтае адценне, але недастаткова доўгае сцябло.

Для пляцення лепш за ўсё падыходзіць салома, нарыхтаваная ўручную.

Для вырабу лялькі выкарыстоўваюць у асноўным тонкую і сярэдняй таўшчыні салому без каленцаў.



1. Пучок саломкі туга перавязваем ніткай.



2. Перавязаць пучок, вывернуць навыварат так, каб саломіны раўнамерна перакрылі месца перавязкі.



3. Сціснуўшы адагнуты пучок у руцэ, туга перавязаць яго.



4. Для рук узяць невялікі пучок саломы, перавязаць яго з абодвух канцоў і па цэнтры.



5. Пучок-рукі ўставіць у пучок-тулава, які папярэдне трэба падзяліць на дзве часткі і адну з іх, якая прыйдзецца на грудзі лялькі, перагнуць.



6. Пасля таго як устаўлены рукі, злучыць часткі пучка-тулава і туга звязаць іх па лініі таліі. Нажніцамі падраўняць канцы саломін па нізе спадніцы і на руках.



7. Для таго каб спадніца не разыходзілася ўнізе, яе можна зафіксаваць, пераплёўшы саломіны па нізе дэкаратыўнай стужкай.



8. Каб схаваць перавязкі, можна накласці на іх дэкаратыўную стужку (прыляпіць або прышыць).

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Давайце з вамі спляцём ”каравай настрою“ нашай сумеснай працы. Удзельнікам раздаюцца кавалачкі ”каравая“, на адваротным баку якога неабходна напісаць свае ўражанні ад майстар-класа.







## Літаратура і інфармацыйны рэсурс


1. История белорусской соломки // [Электронный ресурс]. - 2009. - Режим доступа: http://rukodelkino.com/solomka/600-istorija-belorusskojjsolomki.html. - Дата доступа 02.02. 2016.
2. Лобачевская, О.А., Кузнецова, Н.М. Возьми простую соломку / О.А. Лобачевская, Н.М. Кузнецова. - Мн., 1988.
3. Раманюк, М.Ф. Саломапляценне на Белай Русі / М.Ф. Раманюк // [Электронны рэсурс]. - 1985.-Рэжым доступу: http://rodrus.com/news/news_1320236558.html.- Дата доступу: 2017/01/05.
4. Сахута, Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я.М. Сахута. – Мн., 2001.
5. Сахута, Я.М. Фарбы роднай зямлі / Я.М. Сахута. – Мн., 1985.

## Майстар-клас ”Драўляная цацка ”Жаваранак“



**<u>Педагог-майстар</u>:**

Пціцкі Аляксандр Яўгенавіч ,

педагог дадатковай адукацыі. Працоўны стаж у галіне дадатковай адукацыі – 20 гадоў. На працягу гэта перыяду вучыць дзяцей бачыць незвычайнае ў звычайным кавалку драўніны. На занятках навучэнцы з вялікім энтузіязмам праектуюць і вырабляюць практычныя і патрэбныя рэчы, адпрацоўваюць уменні працаваць са сталярным і платніцкі інструментам, разцамі, атрымоўваюць навыкі геаметрычнай, барэльефнай, плоскорэльефнай, аб’ёмнай, скульптурнай разьбы.

Вучні Аляксандра Яўгенавіча неаднаразовыя пераможцы абласнога конкурсу па дрэваапрацоўцы як тэарэтычнага, так і практычнага тура, рэспубліканскага конкурсу ”Выхаванне на аснове традыцый беларускага народа. Беларуская народная цацка“.











Мэта: распаўсюджанне творчага педагагічнага вопыту.

Задачы:

навучыць паслядоўнасці вырабу драўлянай цацкі ”Жаваранак“;

спрыяць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, вывучэнню традыцый;

павысіць прафесійную кампетэнтнасць і педагагічнае майстэрства педагогаў дадатковай адукацыі.

Удзельнікі майстар-класа: педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі абслугоўваючай працы.

Матэрыяльнае забеспячэнне майстар-класа: драўніна, разец-вушак, падкладка з ДВП, шаблоны, наждачная папера, ручной лобзік па дрэве, клей ПВА.

## Ход правядзення майстар-класа

**Тэарэтычная частка:**

Развіццё мастацкай апрацоўкі драўніны цесна звязана з агульным развіццём беларускага мастацтва і архітэктуры. Сапраўдных старажытных помнікаў мастацтва мастацкай апрацоўкі драўніны захавалася няшмат, таму вывучаюць іх па летапісах, літаратурным крыніцам, фальклору, малюнках.

Мастацкая апрацоўка драўніны – з’ява ўнікальная, якая падаравала свету цудоўныя архітэктурныя помнікі, цікавую разьбу, выдатныя бытавыя рэчы. Народ, выдатна ведаючы каштоўныя якасці дрэва, умела выкарыстоўваў у гаспадарцы ўсе яго часткі. Так, бяростай, якая не ўбірае вільгаць, пакрывалі дах, з палосак бяросты шылі чахлы для захоўвання цеслярскіх і сталярных прылад, каб засцерагчы іх ад ржы, рабілі разнастайныя берасцянкі для захоўвання прадуктаў харчавання, на бяросце пісалі граматы. З наплыву на каранях ліставых парод дрэў, які валодаў цвёрдасцю, пругкасцю і рэдкай прыгажосцю прыроднага малюнка тэкстуры, выраблялі танкасценны посуд. З дубцоў вярбы, якія добра гнуліся, плялі вялікія і маленькія кошыкі.

Існавалі розныя спосабы мастацкай апрацоўкі драўніны, але найбольш распаўсюджаным была разьба. Разьбой упрыгожвалі архітэктурныя збудаванні, мэблю, розныя вырабы і прадметы побыту. Керамічныя пліткі з рэльефным узорам рабілі з дапамогай драўляных формаў. Драўляныя ”друкаваныя“ дошкі ўжывалі для падрыхтоўкі

пернікаў. Разнастайныя сялянскія калаўроты аздаблялі разьбой або разьбой з роспісам.

Майстры мастацкай апрацоўкі драўніны валодалі невычэрпнай фантазіяй, выдатным веданнем матэрыялу, адчуваннем прыгожага, што і дазваляла ім у кожнай працы - ад велічнага храма да драўлянай лыжкі - ствараць сапраўдныя творы мастацтва. Выраб разьбяных вырабаў патрабуе пэўных ведаў пра дрэва, яго ўласцівасці, якасці, апрацоўку. Усе драўнінныя пароды падзяляюцца на мяккія, сярэднія і цвёрдыя. Мяккія пароды не аказваюць моцнага супраціўлення разцу і найбольш спрыяльныя для разьбы. Сярэдняй цвёрдасці драўніна можа быць і мяккай, і цвёрдай, у залежнасці ад умоў росту. Цвёрдыя пароды драўніны, самыя цяжкія для работы, патрабуюць прымянення сілы і пачуцця матэрыялу.

Скульптурная разьба - гэта мастацка апрацаваная з усіх бакоў аб'ёмная фігура, цалкам або ў асноўным адарваная ад фону. Разьба складаная па тэхніцы выканання. Ад разьбяра патрабуецца досвед, мастацкае чуццё, набор розных інструментаў.

Гатовую скульптуру вытрымліваюць у сухім месцы, пры з'яўленні расколін, латаюць іх. Прасушаную скульптуру аздабляюць і наносяць ахоўнае пакрыццё.

Тэма майстар-класа ”Драўляная цацка ”Жаваранак“. Лёс цацкі мае сваю гісторыю.

Цацкі заўсёды былі важнай часткай дзяцінства з самых старажытных часоў. Прыблізная дата з'яўлення дзіцячых драўляных цацак сёння дакладна невядомая. Дакладна невядома і з якога матэрыялу была выраблена першая дзіцячая цацка. У старажытныя часы дзіцячыя цацкі ў выглядзе фігурак вырабляліся з каменю і косці і ўяўлялі сабой фігуркі жывёл.

Самая старажытная драўляная дзіцячая цацка-лялька, была знойдзена пры раскопках у Егіпце. Знойдзеная ў дзіцячым пахаванні лялька-дзяўчынка выраблена з драўляных дошчачак. Прыблізны ўзрост гэтай лялькі складае каля 4000 гадоў. Сёння яна знаходзіцца ў калекцыі Брытанскага музея.

Даўней цацкі з дрэва далёка не заўсёды прызначаліся для дзяцей. Часцяком драўляныя фігуркі выкарыстоўваліся ў розных абрадах і рытуалах, ім прыпісвалася сувязь з замагільнымі сіламі. На Шуміліншчыне фігурка чалавека лічылася абярэгам ад злых духаў, а падораная маладым

падчас вясельнага абраду лялька з’яўлялася абаронцам сямейнага ачага. Як правіла, такія лялькі выконваліся з дрэва.

Кожны народ ствараў свае цацкі, перадаючы ў іх свой погляд на свет, сваё светаадчуванне. Майстэрству вырабу цацак вучыліся ўсё жыццё. Часцей за ўсё ў якасці сыравіны для драўлянай цацкі выбіралася асіна, бяроза, ліпа, хвоя або бук. Суцэльныя цацкі выразаліся з калодачкі або палена, цацкі якія складаюцца з некалькіх злучаных паміж сабой дэталяў рабілі з дошак, яны сустракаліся радзей. Як правіла ў працы над цацкамі майстры карысталіся сякерай і нажом, часам долатам.

Драўляныя цацкі беларускіх майстроў ўяўляюць не меншую каштоўнасць, чым гліняныя. Яны звычайна выраблялiся народнымі ўмельцамі з імітацыяй рухаў або дзеянняў. Да такіх цацак адносяцца ”Кавалі“, ”Пільшчыкі“, ”Конікі“, ”Кураняты дзяўбуць зерне“, ”Мядзведзь-гімнаст“ і інш.

Пры вырабе цацкі з дрэва народныя майстры звярталі ўвагі не на скульптурнасць вырабу, а на тое, каб прыдумаць арыгінальны механізм, які ажывіць драўляную цацку.

Тэхніка драўляных народных цацак простая і даступная дзіцячаму разуменню. Яна пабудавана па найпростых законах механікі. Народныя цацкі з дрэва, бавячы дзіцяці, адначасова знаёмяць яго з навакольным жыццём, працай дарослых (кавалі куюць жалеза, пільшчыкі пілуюць дровы). Акрамя такіх дынамічных цацак народныя майстры рабілі з дрэва птушачак, якіх падвешвалі над дзіцячай калыскай, розныя чалавечыя фігуркі, цацачную мэблю, посуд, прылады працы.

Сучасныя драўляныя цацкі амаль гэтак жа прагрэсіўныя, як электронныя. Машыны, грузавікі і драўляныя цацкі, якія можна запускаць, становяцца выдатнымі падарункамі. Можна знайсці драўляныя ціхія гульні, такія, як шахматы, шашкі і нават крыжыкі-нулікі.

Драўляныя цацкі ў большасці сваёй досыць простыя. Драўляныя пазлы дапамагаюць развіваць пазнавальныя здольнасці, а таксама рухальныя навыкі. Драўляныя цацкі-каталкі і педальныя аўтамабілі таксама развіваюць рухальныя навыкі і паскараюць агульнае развіццё маторыкі. Пажарныя станцыі, фермы і іншыя драўляныя гульнявыя наборы спрыяюць сацыяльнаму і эмацыйнаму развіццю дзяцей. Велізарнае навучальнае значэнне драўляных цацак заключаецца менавіта ў іх прастаце.

У дачыненні да адукацыйнай прасторы народная цацка разглядаецца даследчыкамі як носьбіт сацыяльнай інфармацыі, крыніцай далучэння дзіцяці да духоўных і эстэтычных каштоўнасцяў культуры народа.

Праз народную цацку народ перадае свою любоў і пяшчоту, сваю весялосць і смех, свае думкі і веды.

Поруч з народнай казкай і народнай песняй народная цацка спрыяе фарміраванню ў дзяцей нацыянальнай самасвядомасці, станоўчых адносіны да традыцый свайго народа.

Па народным календары дзень 22 сакавіка называлі Саракі. Лічылася, што ў гэты дзень зіма канчаецца, а вясна пачынаецца. У гэты дзень з цёплых краін прылятаюць сорак розных птушак, і першы з іх - жаўрук. Па прыкметах менавіта з гэтага часу, ”калі сарока пачынае віць гняздо і кладзе ў яго сорак палачак, а з поўдня вяртаюцца сорак розных птушак“, надыходзіць вясна.

Галоўным абрадавым дзеяннем свята ”Саракі“ было выпяканне з прэснага цеста спецыяльных булачак, якія маюць форму птушачак. Гэтыя булачкі і называюцца ”жаўрукі“. Птушачкам рабілі вочкі з разынак, іх раздавалі дзецям, і тыя з крыкам і звонкім смехам беглі заклікаць жаўрукоў, а з імі і вясну:

”Жаўрукі прыляціце,
Сцюдзёну зіму ўнясіце,
Цёплую вясну прынясіце“.

На свята ”Саракі“ акрамя ”жаваранкаў“ пяклі яшчэ і ”калабкі». Але гэта ў тым выпадку, калі пасля зазывания вясны працягваліся замаразкі. Выпяканне ”калабка“ - гэта асаблівы абрад, звернуты да Мароза. Іх пяклі з жытняй або аўсянай мукі. Усяго 40 шарыкаў - ”саракі святыя - калабкі залатыя“ і па адным шарыку выкідалі кожны дзень за акенца, прыгаворваючы: ”Мароз, чырвоны нос, табе хлеба і авёс. А цяпер выбірайся па дабру па здарову!“ Лічылася, што Мароз, пад’еўшы хлебных шарыкаў, сыдзе да наступнага года і не стане перашкаджаць вяснавым пасяўным працам.

Акрамя печаных птушачак, на свята Саракі рабілі яшчэ птушачкі-закруткі, якімі людзі ўпрыгожвалі свае дамы, галіны дрэў. Часцей за ўсё гэтых птушачак рабілі дзеці.

Драўляную цацку ”Жаваранак“ мы паспрабуем зрабіць зараз.

**Практычная частка:**



1. Складанне і замалёўка эскіза. Выразанне шаблону.



2. Падбор і падрыхтоўка матэрыялаў. Перанос эскіза на загатоўку пры дапамозе шаблону з улікам эканоміі матэрыялу.



3. Выпілоўванне элементаў будучага вырабу пры дапамозе ручнога лобзіка па дрэве.

4. Наданне элементам закругленасці пры дапамозе шліфшкуркі і разца-вушака.





5. Зборка вырабу на клей ПВА, аздабленне яго акрылавым лакам, роспісам (па жаданні).

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Удзельнікам майстар-класа неабходна сабраць папараць-кветку. На асобных лісточках удзельнікі запісваюць свае эмоцыі, думкі па выніках сваёй працы і прымацоўваюць іх да стылізаванай выявы папараць-кветкі.

**Літаратура і інфармацыйны рэсурс**


1. Леонтьев, П.В. Работы по дереву / П.В. Леонтьев. – Л. : Детская литература, 1955.
2. Промыслы і рамёствы Беларусі. Мн., 1984.
3. Сахута, Я.М. Народная разьба па дрэве / Я.М. Сахута. – Мн., 1978.




**Майстар-клас**
**”Выкананне ўзора-абярэга ў беларускім арнаменце“**



**<u>Педагог-майстар</u>:**

Сілкіна Маргарыта Альбертаўна, педагог дадатковай адукацыі другой кваліфікацыйнай адукацыі. Працуе ў цэнтры пяты год, кіруе аб’яднаннямі па інтарэсах ”Школа юных рукадзельніц“, ”Свет фарбаў“. Вышыўка, бісерапляценне, выкладванне бісерам, насыпанне, бумагапластыка, жывапіс, графіка, фларыстыка - накірункі дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах. Педагагічнае крэда: мая праца - гэта маё захапленне і маё натхненне.










Мэта: павышэнне прафесійнай кваліфікацыі педагогаў-удзельнікаў майстар-класаў у працэсе актыўных педагагічных зносін, абмен вопытам работы па захаванню і развіццю нацыянальных традыцый у вышаўцы.

Задачы:

прывіццё інтарэса і любові да гісторыі беларускай вышаўкі, традыцый свайго народа;

стварыць спрыяльныя ўмовы для творчага самавыражэння ўдзельнікаў майстар-класа;

сфарміраваць практычныя ўменні па выкананню ўзора-абярэга ”Сонца“.

Удзельнікі майстар-класа: педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі абслугоўваючай працы.

Матэрыяльнае забяспячэнне майстар-класса: канва ”Аіда“, ніткі мулінэ, пяльцы, нажніцы, аловак, схема.

## Ход правядзення майстар-класа

**Тэарэтычная частка:**

Вышыўка - адзін з самых распаўсюджаных і найстарэйшых спосабаў ўпрыгажэння адзення.

У побыце вышыўка была не забаўкай, а абавязкам жанчын і дзяўчат. Калі майстэрства работніцы было на высокім узроўні, рукадзелле магло прыносіць добры прыбытак ўмеліцы. Вышыўка лічылася прэстыжным рамяством.

Узор, вышыты з шчырым клопатам пра блізкага чалавека, набывае ахоўныя ўласцівасці. Усе гэтыя сімвалы - вельмі моцныя знакі, якія павінны аберагаць чалавека. Мы зараз не ўкладваем у іх сэнс абярэга. А нашы продкі верылі, што яны дапамагаюць. Таму і не было ў славян знакаў, якія сімвалізавалі б смерць, боль, гора.

Арнамент

Слова ”арнамент“ паходзіць ад лацінскага слова ”орнаментум“ і ў перакладзе азначае ўпрыгожванне. Арнаментам мы называем ўзор, які складаецца з паўтаральных элементаў. Асноўнае значэнне арнаменту - упрыгожыць паверхню прадмета, падкрэсліць яго форму.

Абярэг- гэта прадмет або сімвал, закліканы абараняць свайго ўладальніка і яго хату ад бед, прыносіць у хату шчасце і дабрабыт.

Галоўнымі багамі на зямлі з’яўляюцца светлае Сонца і Маці-Зямля-Карміцелька. Ад іх пайшло ўсё жыццё на зямлі. Усе багі

падпарадкоўваюцца богу Сонцу. Ва ўсіх людзей бог адзін – святое, светлае Сонейка. Яно саграваe нас, асвятляе шлях да праўды і дабра. Бог Сонца і Маці-Зямля даюць людзям усё: хлеб і ваду, цяпло і святло, рэчкі і азёры, палі і лясы. Трэба адзначыць, што Сонца шанавалі многія народы свету. Адны пакланяліся яму як богу (Старажытны Усход), другія ўзялі за сімвал дзяржаўнасці (Японія), трэція лічылі проста добрым геніем. Галоўным богам было яно і ў нашых продкаў-славян. Называлі яго то Сварогам, то Дажджбогам, то Хорасам.

У старыя часы да Сонца як да бога звярталіся па дапамогу. 80-гадовая А. Васільева з Сянно расказвала, як у яе захварэў сынок. Клікала яна многіх бабак, але ніводная не дала рады. Ды як толькі яна вышыла ўзор Сонца – сын ачуняў. У вышыўцы Васільевай узор Сонца меў выгляд ромба з прамянямі. А ўвогуле гэты матыў, як аказалася, вызначаецца вялікай разнастайнасцю, што і зразумела: паходжанне яго звязана рознымі рода-племяннымі саюзамі нашых далёкіх продкаў, якія і ўспрымалі свяціла па-рознаму.

Пэўным адзінствам вызначаецца хіба што легенда пра збліжэнне сонца з зямлёй. У выніку мёртвая зімовая прырода ажывае і квітнее. Ну, а далей ужо ідуць шматлікія варыянты. Найбольш пашыраны сімвал гэтага саюза – ромб з прамянямі, якія ад яго адыходзяць. Могуць быць розныя мадыфікацыі гэтага матыву. У адных выпадках у цэнтр ромба змяшчаецца крыжык, у другіх - маленькі ромбік. Крыжык у цэнтры матыву Сонца азначае мары вышывальшчыцы пра сваё шчасце, думы пра душу, надзею на дапамогу сонца. Квадрацік (ромбік) сімвалізуе надзеі на добры ўраджай.

Ёсць яшчэ матыў Вялікага Сонца складанай кампазіцыі. Што ён сімвалізуе, устанавіць сёння цяжка. Адны ткачыхі звязваюць яго з лячэннем хвароб, другія – з асаблівай роляй сонца ў прыродзе, трэція – з магіяй. Як ужо адзначалася, матыў сонца мае выгляд ромба з прамянямі ўбакі, а матыў зямлі – такі ж ромб, але з прамянямі ўнутар.

Майстрыхі ўкампанавалі адзін матыў у другі – атрымаўся ўзор, які сімвалізуе яднанне зямлі і сонца. Такая дасканалая кампазіцыя вобразна адлюстроўвае новае жыццё, росквіт прыроды. Падобныя ўзоры пашыраны па ўсёй Беларусі, а магчыма, і ва ўсім славянскім свеце. Праўда, назвы іх бытуюць самыя розныя: Вясна, Жыццё, Ярыла, але ўсе яны, як відаць, маюць адзіны сэнс - вясновае абуджэнне прыроды ў выніку збліжэння зямлі і сонца.

Узоры вышываных вырабаў – гэта зашыфраваны аповяд пра жыццё народа, прыроду, людзей. ”Я ня граматная, - казала М. Хведаровіч з Верхнядзвінска, - не ўмею ні чытаць, ні пісаць. Уся мая навука, мая граматнасць – ва ўзорах маіх посцілак ды ручнікоў. Там, як у добрай кніжцы, як у якім-небудзь кіно, можна дазнацца пра жыццё і людзей, і жывёлы, пра сонейка і зоркі, пра хваробу і пра здароўе, пра дзявочую долю і нядолю, пра ўсё, што ёсць у жыцці“. І гэта сапраўды так.

Адрадзіць нацыянальныя беларускія традыцыі ў вышыўцы, звязаць яе гісторыю з сучаснасцю і растлумачыць важнасць захавання традыцый для будучыні – галоўная задача маёй работы.

**Практычная частка:**

Я прапаную вам вышыць сімвал Сонца і аформіць яго ў паштоўку.

Як вы лічаце, што азначаюць наступныя сімвалы? (кожны ўдзельнік атрымоўвае картку з пэўным сімвалам і спрабуе даць тлумачэнне).

| **Сімвал** | **Значэнне** |
|---|---|
|  | Сімвал кахання |
|  | Дрэва жыцця. Сімвалізуе вечнасць, бессмяротнасць |
|  | Сімвал сонца |
|  | Жытняя баба. Сімвал урадлівасці і жыцця |
|  | Ярыла. Славянскі бог урадлівасці і жыццёвых сіл прыроды |
|  | Шлюб маладых |

| | |
|---|---|
|  | Сімвал продкаў |
|  | Сімвал дзіцяці. Засцерагае дзяцей ад няшчасця. |
|  | Сімвал маці |
|  | Сімвал абярэгу |



Для выканання паштоўкі ўзора-абярэга ”Сонца“ нам спатрэбіцца: канва, іголка, нажніцы, ніткі мулінэ, схема, картон і клей.



Вышываць пачынаем з верхніх праменьчыкаў-атожылкаў, і працягваем вышываць па схеме.



Калі нітка закончыцца, яе трэба замацаваць: прапусціць яе пад шыўком вышытага рада. Нацягваем кончык ніткі і нажніцамі адразаем рэшту ніткі каля самага краю шыўка, затым распраўляем шывок над схаваным кончыкам ніткі.



Незабываем пра вываратны бок, на ім павінна быць акуратна, як і правым боку.



Памятайце, што пры вышаўцы традыцыйных беларускіх арнаментаў у кожным крыжыку робіцца адразу ніжні і верхні шывок.

Пасля таго, як вышыўка гатова, мы пачынаем яе афармляць. Для гэтага нам трэба выразаць прамавугольнік з картона 16х8 см і падзяліць яго на 3 роўныя часткі. Атрымалася 3 квадрата 8х8 см.





У другім квадраце выразаем квадрат 5х5 см.

Уклейваем нашу вышыўку і закрываем адным квадрацікам.





**Заключная частка. Рэфлексія.**

У Вас на сталах ёсць лісточкі трох колераў (зялёны – радасць, жоўты – раўнадушнасць, чырвоны – засмучэнне). Няхай кожны з Вас наклеіць на наша сонейка лісток таго колеру, які адпавядае яго настрою на гэтым мерапрыемстве.





## Літаратура і інфармацыйны рэсурс

1. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышывка / М.С. кацар.– Мн.: Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2013. – 224 с.: іл.

2. Народныя мастацкія рамествы Беларусі / Уклад. Я.М. Сахута. – 2-ое выд. – Мн.:Беларусь, 2001. – 168 с. іл.

3. Сахута, Я.М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: 2-ое выд., перапрац. і дап. / Я.М. Сахута. – Мн.: Беларусь, 2001. – 110 с.: іл.

4. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.

**Майстар-клас**

**”Сувенір у тэхніцы прапільной разьбы па драўніне“**
**(вялікодны сувенір)**



**<u>Педагог-майстар</u>:** Танасіенка Юрый Мікалаевіч, педагог дадатковай адукацыі першай кваліфікацыйнай катэгорыі.

У Шумілінскім раённым цэнтры дзяцей і моладзі Танасіенка Ю.М. працуе з 2009 года. На працягу амаль 10 гадоў з’яўляецца кіраўніком аб’яднання па інтарэсах ”Свет творчасці“. Асноўныя напрамкі дзейнасці – выпілоўванне і выпальванне. Галоўная задача педагога – дапамагчы навучэнцу адкрыць самога сябе.

Юрый Мікалаевіч неаднаразовы пераможца абласнога агляду інавацыйнай і тэхнічнай творчасці навучэнцаў і педагогаў устаноў дадатковай адукацыі.








Мэта: пазнаёміць педагогаў з методыкай вырабу сувеніра ў тэхніцы прапільной разьбы.

Задачы:

стварыць умовы для прадуктыўнага ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва і ўзаеманавучання;

павысіць прафесійную кампетэнтнасць і педагагічнае майстэрства педагогаў дадатковай адукацыі;

навучыць паслядоўнасці вырабу і зборкі вялікоднага сувеніра.

Удзельнікі майстар-класа: педагогі дадатковай адукацыі, настаўнікі абслугоўваючай працы.

Матэрыялы і абсталяванне: эскізы, нарыхтоўкі з драўніны, лобзік, столік для выпілоўвання,

## Ход правядзення майстар-класа

### Тэарэтычная частка

Вялікдзень - гэта найстаражытнае, радаснае, светлае, самае галоўнае свята хрысціянаў; свята, багатае на традыцыі; свята, якое ўсхваляе жыццё. Народнае свята Вялікдзень заўсёды выпадае на пачатак вясны. Дакладную дату гэтаму святу ўстанаўліваюць па месяцоваму календары.

Тыдзень, на пярэдадні свята, называюць светлай велікоднай семядніцай, у якой кожны дзень, пачынаючы з панядзелка, - Светлы. Беларускі народ загадзя рыхтуецца да свята: вытрымлівае шматдзённы Вялікі пост, упрыгожвае дома і двары, наводзіць усюды і ва ўсім ідэальную чысціню. Але найбольш актыўна пачынаюць рыхтавацца да свята з Чыстага (Светлага) Чацвярга. Вернікам належыла ўставаць на світанні, каб абавязкова выкупацца, і такім чынам ачысціцца ад усялякіх грахоў, якія накапіліся за ўвесь год. І толькі пасля гэтага наведаць храм, дзе патрэбна было паспавядацца і прычасціцца. Увечары, у светлую суботу, усе літаральна хрысціяне, святочна апранутыя, з кулічамі, крашанкамі ішлі ў храмы на ўрачыстую ўсяночную. Перад надыходам паўночы раздаваліся звонавыя перазвоны, якія паведамлялі пра набліжэнне моманту Уваскрасення Хрыста. Пад звонавыя перазвоны пачыналі хрэсны ход вакол сабораў.

За адзінаццаць стагоддзяў свайго існавання Вялікдзень набыў сваю арыгінальнасць і каларыт. Бо менавіта святочны велікодны стол істотна вылучае яго сярод іншых праваслаўных святаў. Для свята характэрны

асаблівыя сімвалы - куліч і яйка. Па ўсёй Беларусі, пачынаючы з Чыстага чацвярга, выпякаюць кулічы, рыхтуюць тварожныя пасхі, фарбуюць яйкі рознымі спосабамі. Па старажытным звычаю імкнуліся падрыхтаваць багатае меню, але нават і ў небагатых сем'ях сярод велікодных страў абавязкова быў куліч і размаляваныя яйкі.

Вялікдзень быў жаданым святам ўсіх людзей. У сувязі з гэтым было прыдумана мноства ўсенародных забаў. Большасць гэтых гульняў папулярна і ў наш час. У прыватнасці, абрад біцця вараных фарбаваных яек: хтосьці ўтрымлівае пісанкі ў далоні носікам дагары, а другі б'е па ім носікам другога яйка. У каго пэўна пісанка так і засталася цэлай, той і далей працягвае спаборніцтва з іншымі.

Адна з займальных забаў - катанне яек. У яе варта гуляць на століку ці на падлозе. Галоўная ўмова, каб была роўная паверхня. Дадаткова патрабуецца жолаб, які ставіцца непасрэдна пад нахілам, а таксама коўдра. Любы, хто грае, па латку запускаў яйка, якое скочвалася на коўдру. Пры ўмове, што яйка, якое скацілася, сутыкнулася з яйкам, якое ляжала на коўдры, то гэта і была перамога. Пабітыя яйкі гульцы забіралі сабе. Неабходна было мець навык кіраваць перамяшчэннем яйка. Чым большая колькасць гульцоў, тым весялей і цікавей станавілася відовішча.

**Практычная частка**

Для вырабу велікоднага сувеніра неабходна выкарыстоўваць бярозавую фанеру. Эскізы сувеніра распрацаваны на фанеру таўшчынёй 3 мм, пры выкарыстанні фанеры іншай таўшчыні неабходна змяніць маштаб чарцяжа такім чынам, каб шырыня паз адпавядала таўшчыні нарыхтоўкі.



Пачынаем працу з разметкі загатоўкі. З дапамогай алоўка і лінейкі вычэрчваем неабходную колькасць фанеры, у адпаведнасці з эскізамі.

Адпілоўваем загатоўку з дапамогай нажоўкі. Перш чым перавесці



чарцёж на фанеру, трэба абавязкова выканаць шліфоўку фанеры шкуркай з буйным зернем, а затым з дробным. Зручней шліфаваць драўляным бруском, абгорнутым шкуркай. Неабходна шліфаваць нарыхтаваную фанеру ўздоўж слаёў, а не ўпоперак. Добра адшліфаваная паверхня павінна быць роўнай, цалкам гладкай, глянцава-матавай на святле і шаўкавістай навобмацак. Варта звярнуць увагу на размяшчэнне валокнаў, сучкоў, увагнутасцей і іншыя заганаў, на яе якасць і колер.



Цяпер выканаем перанос малюнка на загатоўку з дапамогай капіравальнай паперы. Пераводзіць малюнак трэба дакладна і акуратна. Неабходна замацаваць чарцёж пры дапамозе кнопак або проста прытрымваць левай рукой. Неабходна праверыць, ці падыходзіць чарцёж па габарытах. Асобныя дэталі варта размясціць так, каб як мага больш эканамічна выкарыстацьць ліст фанеры.



Пасля гэтага прыступаем да выпілоўвання дэталяў па вонкавым контуры. Правіл па выпілоўванню шмат, але прытрымлівацца трэба самых распаўсюджаных: пры выпілоўванні спяшацца не трэба; галоўнае - трымаць лобзік заўсёды прама пад вуглом 90 градусаў; выпілоўваць дэталі неабходна дакладна па размечаных лініях; рухі лобзіка павінны быць заўсёды роўнымі ўверх-уніз; нельга дапускаць скосаў. Калі скос усё ж

адбыўся, то яго можна прыбраць з дапамогай плоскага надфіля. Паварочваць трэба загатоўку, а не лобзік.



Цяпер прыступім да выпілоўвання ўнутранага контуру. Для гэтага папярэдне робім адтуліны шылам. Пры вырабе складаных рэчаў з дробным малюнкам рэкамендуецца спачатку выпілоўваць ўнутраныя элементы і толькі затым прыступаць да выпілоўвання контуру.



Па вышэйапісаным алгарытме выконваем выраб астатніх дэталяў





Выпіленыя дэталі неабходна зашліфаваць з дапамогай наждачнай паперы. Шліфаваць лепш па валакном, гэта дазволіць пазбегнуць драпін на паверхні дэталяў. Таксама неабходна

выкарыстоўваць наждачную паперу розных нумароў, спачатку буйную, а затым дробную.

Прыступаем да зборкі вырабу.



Спачатку збярэм на шыпавое злучэнне ножкі вырабу.

Прымацуем іх да цэнтральнай частцы асновы вырабу.





Дабавім апошнюю дэталь у выглядзе сілуэта курачкі.

Калі нейкія дэталі вырабу не ”садзяцца“, то трэба растачыць гнёзды да патрэбнага памеру. Гэта можна зрабіць з дапамогай лобзіка, наждачнай паперы і надфіля. Дэталі вырабу склейваюцца паміж сабой з дапамогай клею ПВА. Гатовы выраб пры жаданні можна размаляваць фарбамі, пакрыць лакам.

**Заключная частка. Рэфлексія.**

Калектыўнае адмеркаванне вынікаў майстар-класа. Удзельнікі ацэньваюць прадстаўлены вопыт для прымянення ў сваей практыцы.




